# Чыгунка Орша – Лепель: праз гісторыю ў сучасць

**Пасля першага ўзбуйнення БССР (1924 г.) Савет працы і абароны СССР вырашыў тэрмінова пабудаваць чыгунку, якая б злучыла Оршу з Лепелем – апошнім буйным населеным пунктам на мяжы з тагачаснай Польшчай, у якую з 1921 года ўваходзіла Заходняя Беларусь.**

У маі 1925 года корпус войск шляхоў зносін пачаў будаваць чыгунку Орша – Лепель. Земляныя работы вяліся амаль цалкам уручную. На ўсёй трасе быў толькі адзін экскаватар. Не хапала машын, таму асноўным відам транспарту была конная цяга. Але тэмпы ўкладкі пуці былі вельмі высокія. За некалькі месяцаў было ўкладзена 160 кіламетраў пуці, пабудаваны 72 масты.



*Першы цягнік з Оршы ў Лепель, 1926 г.*

Ужо 1 кастрычніка пачаўся рух рабочых цягнікоў па чыгунцы Орша – Лепель. 7 лістапада ў Лепелі адбыўся ўрачысты мітынг у гонар заканчэння будаўніцтва чыгункі Орша – Лепель. З Оршы прыбыў першы цягнік. На мітынгу прысутнічаў камандуючы Заходняй ваеннай акругай будучы маршал **Міхаіл Тухачэўскі.** Удзельнікі будоўлі, якія вызначыліся ў працы, былі ўзнагароджаны спецыяльна ўстаноўленым нагрудным знакам з надпісам: “Орша 1925 Лепел. На память совмест. труда работн. транспорта и Красной Армии”.

З 10 сакавіка 1926 года пачалася часовая эксплуатацыя чыгункі Орша – Лепель. А 15 кастрычніка быў адкрыты пастаянны рух. Пабудаваная чыгуначная ветка садзейнічала прамысловаму развіццю Чашніцкага і Лепельскага раёнаў. Неаднойчы яна станавілася аб’ектам партызанскіх дыверсій падчас “рэйкавай вайны” ў Вялікую Айчынную. У пачатку 1946 года работа чыгункі Орша – Лепель была адноўлена.

З 1956 года прыпыначны пункт Раз’езд 116-га кіламетра стаў называцца Заслонава – у гонар славутага падпольшчыка і партызана Канстанціна Заслонава, лёс якога непарыўна звязаны з Оршай.

У 1971 годзе на змену паравозам прыйшлі цеплавозы. Цяпер дызель-цягнік рэгіянальных ліній – амаль адзіны сродак зносін паміж нашымі гарадамі.

На заканчэнне трэба згадаць імя чалавека, лёс якога таксама цесна звязаны і з Оршай, і з Лепелем. Гэта **Яўген Паўлавіч Юшкевіч** – вядомы гаспадарчы дзеяч Беларусі, начальнік Беларускай чыгункі (1969-1981). Ён скончыў Аршанскі чыгуначны тэхнікум. Пачаў працаваць у Оршы дыспетчарам. У 1934-1937 гадах працаваў начальнікам станцыі Лепель. Перадваенныя і першыя пасляваенныя гады ягоны працоўны шлях звязаны з Оршай.

А ездзіць з Оршы ў Лепель трэба абавязкова летам, калі там праводзіцца Міжнародны фестываль міфалогіі “У госці да Лепельскага Цмока”. А “праславіў” гэту легендарную істоту наш незабыўны **Уладзімір Караткевіч.**

**В. ЛЮТЫНСКІ.**